# І ЎСМІХНУЛАСЯ ЛЕТА...

## Цудоўны дзень адпачынку для выхаванцаў з дзіцячага дома і кадэтаў арганізавалі супрацоўнікі Віцебскага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў

**Дзеці ў віцебскім парку адпачынку імя Савецкай Арміі згулялі ў «вайну», пакаталіся на конях, убачылі работу службовых сабак, паспрабавалі на смак стравы палявой кухні...**

— Я вырас у дзіцячым доме, жыву пры ім у інтэрнаце. Вучуся ў каледжы на машыніста халадзільных установак, — распавядае 16-гадовы выхаванец Андрэеўскага дзіцячага дома Аршанскага раёна Сяргей Катлоўскі.

У дзіцячым доме прыкладна 50 хлопчыкаў і дзяўчынак з розных рэгіёнаў Віцебшчыны ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў. Толькі некаторыя з іх — сіроты, у астатніх бацькі пазбаўлены правоў займацца выхаваннем...



Вядома, у інтэрнаце робяць усё магчымае, каб дзятва не сумавала, адчувала сабе, як дома. У прыватнасці пабудавалі шыкоўны стадыён з новым абсталяваннем, завяршаюць рамонт спартыўнай залы... Але выхаванцы, зразумела, патрабуюць дадатковай увагі. Безумоўна, у іх ёсць патрэба мець стасункі з людзьмі, з якіх можна браць добры прыклад.

— Дзеці школьнага ўзросту з дзіцячага дома вучацца ў звычайнай школе №23 ў Оршы, куды дабіраюцца на транспарце. Але яны маюць патрэбу ў тым, каб нехта праяўляў да іх увагу, акрамя выхавацеляў. Вельмі пашанцавала нам з шэфамі, міліцыянеры — малайцы! — расказвае выхавальніца Ганна Васільева.

Супрацоўніцы ДАІ праводзілі тэсціраванне дзятвы і журналістаў на веданне правілаў дарожнага руху. Некаторыя школьнікі, аказваецца, ведаюць іх лепш. Надоўга запомніцца і экскурсія ў конны клуб «Каліпса», дзе хлопчыкам і дзяўчынкам распавядалі пра нюансы дрэсіроўкі коней і вучылі на іх катацца. Дзеці і дарослыя з задавальненнем сілкаваліся грэцкай кашай з тушонкай і блінцамі палявой кухні в/ч 5524. Вельмі смачнай была і гарбата.

— Плануем і надалей праводзіць такія сумесныя акцыі, аналагаў якіх пакуль няма ў іншых рэгіёнах, — падзяліўся Аляксандр КАЗЮЧЫЦ, супрацоўнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.46 | 17.09 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.44 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.36 | 17.09 |
| Гомель — | 4.34 | 21.23 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.59 | 17.05 |
| Брэст — | 5.05 | 21.50 | 16.45 |

### Месяц

*Першая квадра 24 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

*Пр. Антаніны, Аляксандра, Васіля, Івана, Мікалая, Паўла, Цімафея.*
*К. Ванды, Альбіны, Базыля, Зянона, Пятра, Юзафа.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 23 ЧЭРВЕНЯ

**1810** год — у Мінскай губерні нарадзіўся Іван Пятровіч Барычэўскі (Барычэўскі-Тарнава), беларускі гісторык, археограф, этнограф, фалькларыст. Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі, этнаграфіі і археалогіі, у тым ліку — «Даследаванне аб паходжанні, назве і мове літоўскага народа», «Хроніка Быхаўца», «Жыццяпіс Касцюшкі», «Камяні Літоўскіх багінь», «Урывак з Літоўска-Рускай гісторыі» і інш. Удзельнічаў у зборы матэрыялаў і падрыхтоўцы выданняў археаграфічнай камісіі. Сабраў і выдаў шмат мясцовых паданняў, легенд і павер'яў. Памёр у 1887 годзе.

**1940** год — у Чалябінскай вобласці Расіі нарадзіўся Аляксандр Цімафеевіч Шастакоў, беларускі мастак. У 1975 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Аўтар твораў «Мая мама», «Партрэт бацькі», «Епіскап Канстанцін», «Сланечнік» і інш. Яго карціны адрозніваюцца тонкасцю каляровых нюансаў, мяккім каларытам, лірычнасцю.

**1995** год — адкрыты для наведвальнікаў Аршанскі этнаграфічны музей «Млын», філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. Размяшчаецца ў гістарычным цэнтры горада, паміж рэкамі Днепр і Аршыца, у будынку вадзянога млына (помнік прамысловай архітэктуры пачатку XX ст.). Асноўная мэта канцэпцыі музейнай экспазіцыі — адлюстраванне найбагацейшай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Аршанскага рэгіёна 2-й паловы XIX—пачатку XX ст. Прадстаўлены прылады працы земляроба, прыстасаванні для апрацоўкі лёну, багатая калекцыя ткацтва, якая ўключае разнастайныя па дэкоры, каларыце і тэхніцы выканання пакрывалы, ручнікі і абрусы, камплекты самабытнага аўтэнтычнага беларускага традыцыйнага касцюма, а таксама ганчарныя вырабы, копіскная кафля, прадметы сучаснага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



### Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:**

*«П'яныя напоі шкодзяць не толькі прапойцам, але і ўсяму грамадству».*

## Азбука народнай культуры

### ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

СВАТАЎСТВА. Калісьці сватаўства мела вельмі важнае грамадскае значэнне, таму што шмат у чым перадвызначала не толькі шлюбны саюз маладой пары, але і характар адносін паміж двума родамі. Гэты першапачатковы крок звычайна ўлічваў сацыяльнае становішча дзвюх сем'яў, адносіны да іх з боку аднавяскоўцаў, а таксама грамадскае прызнанне будучых жаніха і нявесты, іх любоў да працы, здольнасць да ручной работы, сяброўскія адносіны са сваімі аднагодкамі.

Звычайна сват накіроўваўся «на заручыны» з боханам хлеба і пляшкай гарэлкі. Пляшка гарэлкі «хадзіла» па стале паміж удзельнікамі сватаўства, а бохан хлеба маці нявесты павінна была падзяліць на столькі кавалачкаў, колькі людзей сядзела за святочным сталом.

З таго моманту, як сват пераступіць парог хаты будучай нявесты, пачынаўся адказны перадшлюбны перыяд. Яго сэнс зводзіўся да таго, каб перакінуць масток узаемапаразумення і ўзаемапавагі паміж двума родамі. Калі гасцям былі рады, перш за ўсё іх запрашалі за стол. Падчас застолля вяліся няспешныя размовы, найперш, як гэта ні дзіўна для нашых сучаснікаў, размова была эканамічнага характару: дзе маладыя будуць жыць пасля вяселля, што будзе дадзена ў пасаг за жаніхом, за нявестай і г. д.

Сватаўства лічылася паспяховым, калі напрыканцы вячэры маці будучай нявесты выконвала глыбока сімвалічны рытуал: у пляшку, якую прынёс сват, яна насыпала зерне жыта, загортвала ў ручнік і вяртала госцю, што азначала: «Пасеянае зерне абавязкова прарасце новым коласам».

Людзі сталага веку ведалі такія-сякія хітрыкі: «Калі пойдзеце да будучай нявесткі ў сваты, няхай першым заходзіць сын. Шапку перад яе бацькамі не здымаюць, пакуль гасцей не запросяць за стол. Калі хтосьці з тых, хто прыйшоў у сваты, здолее знесці з хаты нявесты лыжку, то сын будзе ў хаце гаспадаром і жонка яго ніколі не пакіне. Праз тры месяцы пасля вяселля лыжку неабходна падкінуць назад — у хату нявесты».

Пасля сватаўства, якое праходзіла ў хаце нявесты, праз некаторы час ішлі ў хату жаніха або зноў збіраліся ў хаце нявесты. Гэтыя «дыпламатычныя сустрэчы» двух бакоў называліся па-рознаму: «заручыны», «запоіны», «змовіны» (у залежнасці ад рэгіёна) — і таксама прысвячаліся таму, каб высветліць усе неабходныя пытанні па падрыхтоўцы да вяселля і далейшага жыцця маладых.

## УСМІХНЕМСЯ

**Няшчасны выпадак адбыўся на фестывалі піва — у гараж наведалася жонка.**

Малады муж прыходзіць з працы і незадаволена моршчыць нос:

— Ты зноў нешта спаліла на кухні?

— Так. І цяпер становішча бязвыхаднае: згарэла кніга пра смачную і здаровую ежу.

**Галоўнае адрозненне паміж жывёламі і людзьмі заключаецца ў тым, што жывёлы не трымаюць у сябе дома людзей. Хоць каты могуць не пагадзіцца.**

— Вось, купілі дачу для адпачынку.

— Ну і як, адпачываеце?

— Так. Калі на дачу не ездзім...

**Навукоўцы даказалі — ідэальны шлюб магчымы. Ажаніцеся як мага раней на самай сцярвознай жанчыне са сцярвознай цешчай. Жывіце 5 гадоў і рабіце ўсё, што яны хочуць. Потым разводзьцеся, і ваш наступны шлюб з любой жанчынай будзе ідэальным.**

Геній ніколі не скажа, што ён геній. Па сабе ведаю.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2482.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 чэрвеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12